Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №5(68), 2011

*УДК 93*

# Пінскае паўстанне 1648 года

С. А. Чаропка

У прадстаўленым артыкуле даследуюцца некаторыя аспекты паўстання мяшчан Пінска ў 1648 г., звязаныя з разгортваннем антыфеадальнага руху і міжканфесійнай і міжэтнічнай барацьбой падчас казацка-сялянскай вайны на Беларусі.
**Ключавыя словы:** казацка-сялянская вайна, Пінск, паўстанне, казакі, шляхта, мяшчане, А.С. Радзівіл, войска ВКЛ, бітва, рэлігійная барацьба.

In the present article explores some aspects of the uprising burghers of Pinsk in 1648 associated with the deployment of anti-feudal movement and inter-faith and inter-ethnic fighting during the Cossack-Peasant War in Belarus.
**Keywords:** Cossack-Peasant war, Pinsk, uprising, cossacks, szlachta, commoners, Janusz Radziwill, army of Grand Duchy of Lithuania, the battle, inter-faith fighting.

Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. з'яўляецца адной з найбольш значных падзей у айчыннай гісторыі перыяду феадалізму, яна ўяўляе сабой самы яскравы прыклад адкрытай сацыяльнай барацьбы на беларускіх землях. Вайна ахапіла значныя тэрыторыі, прыцягнула да ўдзелу велізарныя масы насельніцтва, якія рэпрэзентавалі розныя сацыяльныя групы і праследавалі розныя мэты. Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. стала ўвасабленнем глыбокага цывілізацыйнага крызісу, велізарнай нацыянальнай катастрофы, якая адбылася ў беларускім грамадстве ў XVII ст. Менавіта казацка-сялянская вайна распачала ў беларускай гісторыі перыяд, які ва ўкраінскай гістарыяграфіі атрымаў слушную назву "Руіна", а ў польскай гістарычнай літаратуры – "Патоп". Нягледзячы на тое, што сэнс гэтых тэрмінаў ва ўкраінскай і польскай навуковай літаратуры не тоесны, для беларускіх зямель ВКЛ ён фактычна аднолькавы, таму што Беларусь перажыла ў сярэдзіне XVII ст. і ўварванне вялізных замежных армій, і, як наступства, сур'ёзна пацярпела ад войн 1648–1651 гг. і 1654–1667 гг. Маштабнасць падзей казацка-сялянскай вайны, яе значэнне для далейшага лёсу беларускага народа робіць даследаванне вайны і асобных яе фрагментаў дастаткова актуальным. Адным з найбольш яскравых эпізодаў казацка-сялянскай вайны з'яўляецца паўстанне жыхароў Пінска супраць існуючага ў ВКЛ ладу.

Казацка-сялянская вайна на Беларусі 1648–1651 гг. пачалася пад непасрэдным уплывам падзей у Запарожжы і на Левабярэжнай Украіне. Перамогі Б. Хмяльніцкага пад Корсунем і Жоўтымі Водамі спрыялі разгортванню на Украіне сялянскай вайны, якая з'яўлялася арганічнай часткай вызваленчай вайны ўкраінскага народа. Падыход асноўных сіл казацкага войска Хмяльніцкага напрыканцы мая 1648 г. да Белай Царквы і з'яўленне казацкіх атрадаў у Рэчыцкім і Мазырскіх паветах спрыялі разгортванню летам 1648 г. сялянскіх і мяшчанскіх паўстанняў у Паўднёва-Усходняй Беларусі. З'яўленне ўкраінскіх казацкіх атрадаў на тэрыторыі ВКЛ фактычна распачало неабвешчаную вайну двух палітычных суб'ектаў – ВКЛ і Запарожскай Сечы, ад імя кіраўніка якой дзейнічалі казакі. Сінтэз гэтых дзвюх войнаў прывёў да пачатку казацка-сялянскай вайны на Беларусі, якая з'яўлялася аднначасова і ўнутрыпалітычнай, і знешняй з'явай. Блізасць вялікага казацкага войска ўпэўнівала беларускае сялянства і мяшчанства, частку праваслаўнай шляхты ў поспеху барацьбы супраць існуючага палітычнага ладу і рабіла барацьбу перспектыўнай справай.

Гарнізоны ВКЛ аказаліся непадрыхтаваны да барацьбы з казакамі, таму што галоўная ўвага надавалася небяспецы верагоднай вайны з Расійскай дзяржавай [1, с. 217]. Смерць караля польскага і вялікага князя літоўскага Уладзіслава IV Вазы 20 мая 1648 г. у спалучэнні з казацкім паўстаннем на Украіне стварыла надзвычай спрыяльныя ўмовы для магчымай агрэсіі з боку Расійскай дзяржавы. Гэта відавочна праявілася падчас рэйда казацкага палкоўніка

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

П. Галавацкага ў Старадубскі павет. У першай палове ліпеня 1648 г. пры дапамозе мясцовага сялянства і гомельскіх мяшчан казацкі загон авалодаў горадам. Разгром кароннага войска на Украіне, поўная непадрыхтаванасць войска ВКЛ да падобнага роду небяспекі і актыўная падтрымка з боку часткі беларускага насельніцтва дазволілі казакам у ліпені 1648 г. амаль бесперашкодна распаўсюдзіцца ў беларускім Палессі і Падняпроўі.

У другой палове ліпеня з Украіны на Беларусь былі накіраваны казацкія загоны пад кіраўніцтвам Антона Нябабы, Крывашапкі, Мікуліцкага, Філона Гаркушы, Яна Сакалоўскага, Грыцко Бута, Напальчыча, якія імкліва распаўсюдзіліся па Палессі, заклікаючы сялян і мяшчан далучыцца да іх [2, с. 101]. Заклікі казацкіх правадыроў знайшлі падрыхтаваную глебу на Беларусі, што садзейнічала актыўнаму далучэнню часткі беларускага насельніцтва да паўстання. Як сведчаць крыніцы, жыхары Брагіна, Лоева, Гомеля самі адчынілі брамы і ўпусцілі казакоў у гарады. Гэтыя загоны былі накіраваны для замацавання ў Палессі і Падняпроўі, прыкрыўшы такім чынам правы фланг асноўнага войска Багдана Хмяльніцкага. Стратэгічнай мэтай гэтых загонаў з'яўлялася пашырэнне паўстання ў беларускіх паветах ВКЛ [3, с. 118].

У верасні 1648 г. войска Б. Хмяльніцкага падыйшло да Пілявіцаў, што паўплывала на пашырэнне зоны дзеяння казацка-сялянскіх атрадаў на Беларусі за кошт іх паралельнага прасоўвання ў Пінскі і Берасцейскі паветы. У Берасцейскі павет у жніўні-верасні 1648 г. рушыў казацкі загон пад кіраўніцтвам палкоўніка Максіма Гладкага [4, арк. 1–2]. Разгром кароннага войска пад Пілявіцамі 23 верасня садзейнічаў умацаванню ідэй паўстання сярод беларускага сялянства і адпаведна ўмацаванню пазіцый казакоў на Беларусі.

Напрыканцы верасня пад Кобрынам паўстанцамі быў разбіты полк драгунаў пад кіраўніцтвам стольніка літоўскага В. Гасеўскага, горад быў заняты казакамі [5, с. 124]. Улічваючы, што ў гэтым рэгіёне дзейнічаў загон М. Гладкага, прававерна выказаць меркаванне аб яго дачыненні да гэтай бітвы [6, s. 117].

Поспех украінскіх паўстанцаў пад Пілявіцамі і падыход Хмяльніцкага да Замосця ў лістападзе 1648 г. прывялі да ўмацавання ў свядомасці беларускага сялянства меркавання аб моцы казакоў і парадзілі надзею ў перспектыўнасць саюза з казацкай Украінай. Гэтая акалічнасць найбольш яскрава праявілася ў выглядзе паўстання мяшчан у Пінску, якое ўяўляе сабой найбольш красамоўны прыклад сацыяльнай барацьбы на Беларусі на першым этапе казацка-сялянскай вайны.

Яшчэ ў канцы жніўня пінскі маршалак Лукаш Ельскі ў сваім лісце на соймік у Слонім адзначаў, што "халопства" спачувае казакам, "робіць вялікія шкоды па мястэчках і дамах шляхецкіх" і блізкае да паўстання [7]. Са спасылкай на "Гістарычны помнік аб Пінску" большасцю даследчыкаў храналагічныя рамкі паўстання вызначаюцца канцом верасня – першай паловай кастрычніка 1648 г. [2, с. 106; 8, с. 191]. Аднак уважлівае даследаванне комплекса крыніц прадстаўляе іншую храналогію Пінскага паўстання. Маніфест гвардыяна францысканцаў Станіслава Машчынскага паведамляе, што 25 кастрычніка ў горадзе склалася небяспечная для каталіцкага насельніцтва сітуацыя, але Пінск яшчэ не знаходзіўся ў руках паўстанцаў [9, с. 37]. У пратэсце рэктара калегіі езуітаў Пінска Станіслава Тамашэўскага паведамляецца, што пінскія мяшчане ўпусцілі казакоў у горад 26 кастрычніка [10, с. 383]. Генерал Пінскага павета Андрэй Сачкоўскі ў сваім пратаколе адзначыў, што першыя спробы падавіць паўстанне адносяцца да 5 лістапада [11, с. 36]. Альбрыхт Станіслаў Радзівіл у сваіх успамінах паведамляе, што пінскі пасол на сойме "рэляцыю ўчыніў, як Пінск праз здраду мяшчан узяты быў ад казакоў" і прасіў аб дапамозе ў падаўленні паўстання толькі 9 лістапада, значна пазней падзей пад Брэстам, якія адбыліся ў кастрычніку [12, s. 339]. Каралеўскі сакратар Ян Рудаўскі ўзгадвае, што звесткі аб тым, што "літвіны каля горада рускага Пінска ... разграмілі 20 тыс. казакоў", прыйшлі на элекцыйны сойм толькі ў другой палове лістапада [13, s. 57]. Комплексны аналіз некалькіх крыніц дае магчымасць выказаць меркаванне аб тым, што ў першай частцы "Гістарычнага помніку аб Пінску", на які спасылаліся раней даследчыкі, памылкова пазначаны месяц, калі праходзілі падзеі ў Пінску [14, с. 32–33]. Гэтая акалічнасць можа быць звязана з тым, што гэты помнік неаднаразова перапісваўся і дацыроўка магла быць перададзена няверна. Звесткі аб тым, што паўстанне трэба адносіць да больш позняга перыяду, падаюцца ў другой частцы тэкста гэтага ж "Гістарычнага помніку" [14, с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

35]. Такім чынам, у "Гістарычным помніку аб Пінску" замест кастрычніка трэба разумець лістапад, у выніку чаго вымалёўваецца наступная карціна.

25 кастрычніка ў Пінску склалася небяспечная для шляхты і каталіцкага духавенства сітуацыя, пачалося бегства каталіцкага насельніцтва з горада [9, с. 37]. Наступным днём, 26 кастрычніка, у горадзе распачалося паўстанне мяшчан, якое ўзначалілі прадстаўнікі гарадскога магістрата. Гвардыян Станіслаў Машчынскі абвінавачвае лентвойта Івана Сулкоўскага, бурмістраў Багдана Стаяновіча і Якава Суліча, а таксама 6 ратманаў, 5 лаўнікаў, 4 цэхмістраў і "іншых" у тым, што яны, "прыняўшы казакоў за паноў сваіх", прынялі актыўны ўдзел у паўстанні [9, с. 37]. Паўстаўшыя пінчукі ўпусцілі казакоў у горад і нават планавалі стварыць мяшчанскі атрад колькасцю 7 тыс. чалавек [14, с. 33].

У выніку авалодання казакамі Пінскам у горадзе пачаўся грандыёзны пагром, ад якога пацярпела перш за ўсе каталіцкае і яўрэйскае насельніцтва павятовага цэнтра. Паводле яўрэйскіх хронік, менавіта ў Берасці і Пінску налічваецца найбольшая колькасць ахвяр з ліку яўрэяў, што ўчынілі казакі. Як адзначыў яўрэйскі летапісец Меер, пасля ўваходу казакаў у Пінск яны злітаваліся "толькі над праваслаўнымі, а мноства бедных жабракоў-яўрэяў, якія не здолелі з прычыны недахопу сродкаў уцячы, былі знішчаны самымі пакутніцкімі спосабамі" [15, с. 165]. Паўстанцы і казакі сумесна "касцёлы Божыя рабавалі, нападалі … на дамы шляхецкія" [14, с. 34]. Рэктар Пінскага езуіцкага калегіума ксёндз Станіслаў Тамашэўскі абвінавачваў казакаў і жыхароў Пінска ў тым, што яны "стан шляхецкі і духоўны забівалі, мардавалі, целы са склепаў выцягвалі і ў касцёле айцоў езуітаў вялікія гвалты зрабілі, абразы пасеклі, вокны разбілі, касцёл у пыл пераўтварылі, целы са склепаў, з трунаў вынімаючы, выкідалі". Казакі, разам з мяшчанамі, разрабавалі ўсе залатыя і сярэбраныя ўпрыгажэнні з касцёла, а таксама з фальваркаў, якія належалі касцёлу і калегіуму каля Пінска [10, с. 383–384]. Быў забіты і закатаваны манах-францысканец Халеўскі.

Напрыканцы кастрычніка войска ВКЛ пад кіраўніцтвам Рыгора Мірскага пачало рыхтавацца да падаўлення паўстання ў Пінску, і да пачатку лістапада яно ўвайшло ў в. Хомск у 70 км на паўночны захад ад Пінска. Адначасова з гэтым сабралася павятовая харугва шляхты пад кіраўніцтвам Л. Ельскага. 5 лістапада Ельскі папрасіў падмацавання ў Р. Мірскага, але, не чакаючы яго, на чале пінскай шляхты і адной харугвы В. Гасеўскага ён паспрабаваў авалодаць горадам. Не сустракаючы супраціўлення, шляхецкі атрад увайшоў у горад, дзе трапіў у загадзя падрыхтаваныя паўстанцамі пасткі. Паміж паўстанцамі і шляхціцамі ў горадзе распачаўся ўпарты бой, паўстанцы бараніліся "як маглі, хто са стрэльбаў, хто косамі, хто палкамі, іншыя кідаючы камянямі, паленамі, і чым хто мог" [14, с. 32].

У выніку боя шляхецкі атрад вымушаны быў адысці на поўнач да вёскі Ставок. Пінскія паўстанцы, узрадаваныя перамогай, умацавалі саюз з казакамі заключэннем дагавора, паводле якога казацкі атрад павінен быў не адыходзіць з Пінску да Раства, кожны казак атрымоўваў грашовае і пайковае забеспячэнне, а самому атраду гарантавалася выплата 10 тыс. злотых [14, с. 33].

7 лістапада кавалерыя шляхецкага войска пад кіраўніцтвам Мірскага з Хомска перасунулася ў в. Ахова, дзе да 8 лістапада стражнік ВКЛ чакаў падыходу пяхоты і артылерыі. 9 лістапада злучаныя сілы Мірскага і пінскай шляхты пад кіраўніцтвам Ельскага падыйшлі да горада і абстралялі яго з 8 гармат. Пінскі войт накіраваў у горад ультыматум з патрабаваннем здачы горада, даючы на роздум гадзіну. У сувязі з адмовай мяшчан і казакоў шляхецкае войска пайшло на штурм горада, які працягваўся "з палудня гэтага панядзелка да палудзеннага часу наступнага дня, усю ноч і дзень" [14, с. 34].

З боку Северскай брамы на горад ударылі 120 драгунаў Гасеўскага і 200 пешых жаўнераў Пятра Падлеўскага. Дзве харугвы Ельскага атакавалі Ляшчынскую браму. Пры дапамозе харугваў Паўловіча і рэйтараў Шварцоха шляхецкія сілы здолелі ўварвацца ў горад, але тут яны сустрэлі адчайнае супраціўленне з боку паўстаўшых мяшчан і казакоў. "(Шляхціцы – С.Ч.) павінны былі амаль кожны дом штурмаваць, таму што непрыяцель (паўстанцы – С.Ч.), адкінуты ад агароджы і рагатак, моцна абараняўся ў зачыненых дамах" [14, с. 34]. Спробы казакоў увечары 9 лістапада вырвацца з горада аказаліся беспаспяховымі, магчымыя шляхі адыходу кантраляваліся шляхецкімі атрадамі.

У выніку штурма да 10 лістапада горад быў узяты, паўстанне жорстка падаўлена. Тут жа, у "Гістарычным помніку", паведамляецца аб страшнай камеце, якая "паказалася 9 чысла лістапада … над самым горадам Пінскім", у выглядзе крывавага мяча ляззём уніз, а таксама 10 лістапада, "калі ўжо святой справядлівасці рука панавала над горадам" [14, с. 34]. Гэтае паведамленне супярэчыць ранейшым звесткам гэтай жа крыніцы аб тым, што падзеі быццам бы разгортваліся ў кастрычніку, і яшчэ раз пацвярджае гіпотэзу аб неабходнасці прывязкі падзей да лістапада 1648 г. 25 лістапада А.С. Радзівіл паведамляе: "Войска наша літоўскае сілай адабрала ў казакоў Пінск пасля 14 дзён", г. зн. паўстанне доўжылася 2 тыдні, што дакладна супадае з прыведзенай вышэй храналогіяй падзей [12, s. 350]. Такім чынам, храналагічныя рамкі Пінскага паўстання знаходзяцца ў межах з 26 кастрычніка да 10 лістапада 1648 г.

Вынікам паўстання і яго падаўлення сталі сур'ёзныя дэмаграфічныя страты і гаспадарчае разбурэнне ў рэгіёне. Аб гэтым сведчаць соймавыя канстытуцыі 1649, 1651 і 1653 гг. Паводле канстытуцыі 1649 г., для ўсіх паветаў ВКЛ быў ухвалены надзвычайны падатак, але з прычыны моцных разбурэнняў Брэсцкі, Пінскі і Мсціслаўскі паветы абавязаны былі заплаціць на 30% менш.

Значна скарацілася насельніцтва горада. Паводле звестак Г. Кунакова: "Пінск разарыў стражнік літоўскі Р. Мірскі і мяшчан забіў больш за 3 000 чалавек і жонак іх, і дзяцей загадаў пабіць без літасці" [1, с. 297]. Канцлер ВКЛ А.С. Радзівіл ацэньвае дэмаграфічныя страты ў Пінску ў 14 тыс. чалавек "маладых і старых" [12, s. 351]. Прычым жорсткасць у Пінску не была выпадковай, а наўмыснай і мэтанакіраванай, што адзначалі ўжо сучаснікі. "Паколькі гэты горад быў адным з галоўных казацкіх прыстанішчаў, палякі для запалохвання іншых абрабавалі яго і пераўтварылі ў попел", – адзначае французскі вандроўнік П. Шэвалье [16, с. 99]. Пакаранне Пінска стала прыкладам для іншых паўстаўшых гарадоў.

Разам з тым, паўстанне ў сукупнасці з іншымі падзеямі казацка-сялянскай вайны прымусіла пануючыя колы пайсці на некаторыя саступкі. 12 студзеня 1650 г. кароль Ян Казімір на сойме пацвярдзіў ранейшыя прывілеі Уладзіслава IV, якія значна пашыралі правы праваслаўнага насельніцтва ў вызнанні сваёй канфесіі. Паводле каралеўскага прывілея, дазвалялася, дзе "цэрквы пагарэлі і разрабаваны так у Пінску, у Мазыры і ў іншых гарадах, на тых жа месцах старых будаваць з дрэва і з камення вольнасць даем" [17, с. 252-253]. Пацвярджаліся правы праваслаўнага духавенства. "Прэсвітары, таксама папы рускія, якія не знаходзяцца ва ўніі, каб пры вольнасцях стану духоўнага заставаліся і ніякімі павіннасцямі … падаткамі … стацыямі жаўнерскімі і работамі нідзе не былі заняты … і ні да каго з свецкіх, толькі да старшых сваіх належалі духоўных" [17, с. 254].

Імкнучыся прыцягнуць на свой бок праваслаўную шляхту і мяшчанства, Ян Казімір у 1650 г. яшчэ раз пацвярдзіў правы гэтых сацыяльных груп. "Да ўрадаў належыць народ рускі, каб на роўных прыманыя былі і ніякага прыціску не мелі". Каралеўская ўлада зрабіла крок насустрач паўстаўшым мяшчанам: "Мяшчан Кіеўскіх, Чарнігаўскіх, Вінніцкіх, Мазырскіх, Рэчыцкіх, Старадубскіх, Пінскіх і іншых, куды бы вайна ні дайшла, пры старых правах і вольнасцях захоўваем" [17, с. 254]. Пінскае паўстанне з'яўляецца найбольш яскравым з серыі гарадскіх паўстанняў у беларускім Палессі ў XVII ст.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Літаратура**

1 Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные археографическою комиссиею. – СПб.: в тип. П.А. Кулиша, 1861. – Т. 3. – С. 604, 134, 22.

2 Абецедарский, Л.С. Борьба белорусского народа за воссоединение Белоруссии с Россией в середине XVII века / Л.С. Абецедарский // Воссоединение Украины с Россией: сб. статей. – М.: Изд-во АН СССР, 1954. – 440 с.

3 Документы об Освободительной войне украинского народа 1648–1654 гг. – К.: Наукова думка, 1965. – 825 с.

4 Львоўская навуковая бібліятэка Нацыянальнай Акадэміі навук Украіны імя В.С. Стэфаніка (ЛНБ). – Ф. Сапегаў. – Спр. 1495. – Арк 1–2. – Ліст Яна Паўла Сапегі.

5 Донесения Папского Нунция, Иоанна Торреса, архиепископа Адрианапольскаго, о событиях в Польше во время восстания Богдана Хмельницкого. – К.: типо-литография М.Т. Мейнандера, 1914. – 181 с.

6 Podhorodecki, L. Zarys dziejów Ukrainy / L. Podhorodecki. – Warszawa: Książka i Wiedza, 1976. – T 1. – 311 s.

7 ЛНБ. – Ф. Асалінскіх. – Спр. 225/II. – Арк. 137 адв. – Копія ліста Л. Ельскага (1648 г.).

8 Абецедарский, Л.С. Борьба белорусского народа за воссоединение Белоруссии с Россией в середине XVII века / Л.С. Абецедарский // Воссоединение Украины с Россией: сб. статей. – М.: Изд-во АН СССР, 1954. – 440 с.

9 Манифест ксендзов францисканцев пинских // О бунте города Пинска и усмирении онаго. – М.: в университетской тип., 1847. – С. 37–38.

10 Протест Пинского иезуитского монастиря на мещан пинских // Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. – Минск: в губернской типографии, 1848. – С. 383–384.

11 Протокол Пинского гродского суда освидетельствования и представления частей тела кс. Доминика Холевского проповедника // О бунте города Пинска и усмирении онаго. – М.: в университетской тип., 1847. – С. 35–36.

12 Pamiętniki Albrychta Stanisława X. Radziwiłła kanclerza W. Litowskiego. Wydane z rękopismu przez Edwarda Raczyńskiego. – T. II. – W Poznaniu, 1889. – U braci Scherków. – 490 s.

13 Rudawski, W. J. Historia Polski od śmierci Władysława IV aż do pokoju Oliwskiego, czyli dzeje panowania Jana Kazimierza od 1648 do 1660 r. / W. Rudawski. – Petersburg, Mohilew: Wolff, 1855. – T. I. – 188 s.

14 Исторический памятник о Пинске // О бунте города Пинска и усмирении онаго. – М.: в университетской тип., 1847. – С. 31–35.

15 Тяготы времён. Хроника Мейера из Щебржешина // Еврейские хроники XVII столетия: (Эпоха "хмельничины"). – М.; Иерусалим: Гешарим, 1997. – С. 153–180.

16 Шевальє, П. Історія війни козаків проти Польщі. З розвідкою про їхне походженя, країну, звичаї, спосіб правліня та релігію і другою розвідкою про перекопськіх татар / П. Шевальє; пер. з франц. вид. 1663 р. – Київ: Вид-во Акад. наук УРСР, 1966. – 199 с.

17 Actum in Curia Regia Varsauien // Собрание древних грамот и актов городов Минской губернии, православных монастырей, церквей и по разным предметам. – Минск: в губернской типографии, 1848. – С. 250–255.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступило 11.01.10

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ